## 31. ВОРВОЧЭНСКЭ

Ворвочэнскэ – востраў сярод балот, за тры кіламетры ад Горска. У палескім слове чуецца беларускае “ворыва”. Востраў дзяліўся на дзве функцыянальныя зоны. Сарцавіна вострава была акультурана пад ворыва, пачаргова яго займалі лубінам, бульбай, жытам, ільном. Па нізінных ускрайках, спаўзаючы ў балота, месцілася сенажаць.

Ворыва і сенажаць па ўсім востраве размяжоўвала кальцавая дарога. Па ёй можна было пад’ехать у любы куток. Па сенажаці не ездзілі ні возам, ні трактарам, каб не псаваць траву.

Восенню шэсцьдзесят другога мяне, дзевяцікласніка, школа накіравала на практыку да бацькі-трактарыста. На трактары МТЗ-2 (без кабіны) мы паехалі на Ворвочэнскэ араць пад зябліва. Разварочваючыся на канцы поля, я заехаў на сенажаць, пакрэмзаў траву коламі і плугамі, забуксаваў. Помню, як бацька крычаў: “Ты спортыў травыцу!” Даў мне рыдлёўку: ідзі зараўняй, каб было прыгожа, як раней.

Вясной, калі мы сеялі там яравыя, я збегаў паглядзець, як залячыўся мой восеньскі парэз на сенажаці. І не знайшоў тое месца. Густая зялёная трава свяцілася як шоўк. Была раўнюткая бы стол.

Людзі тут пастараліся задоўга да мяне: рыдлёўкай зрэзалі купіны, засыпалі ўпадзіны, сякерай ссеклі кожны кусток і пянёк. Касіць Ворвочэнскэ – адно задавальненне. Касіць і спяваць.

Ворвочэнскэ – ачалавечаны балотны востраў. Чалавек шчыраваў тут ад маразоў да маразоў. Глеба на востраве была цёмнай, тлустай. Без аніякай хіміі тут з гектара збіралі па 15-20 цэнтнераў экалагічна чыстага збожжа.

Пасля асушэння балота востраў ператварыўся ў пясчаную выспу. Збожжа на ёй гарыць у маі, бульба моршчыцца ў чэрвені.

Тое, што зрабілі з востравам Ворвочэнскэ ў калгасна-саўгасную эпоху, назвалі: меліярацыя. Ніхто яшчэ не падлічыў, колькі гектараў стараворыўнай зямлі загубілі ў Беларусі ў шасцідзесятыя-васьмідзесятыя гады дваццатага стагоддзя дзеля асваення балот. Саромеюцца? Баяцца крымінальнай і маральнай адказнасці? Па маіх падліках, у выніку “меліярацыі” Беларусь страціла прыкладна 3 мільёны гектараў зямлі, якая стагоддзямі карміла беларусаў. І столькі ж зруйнавана балот.

Бацька даў мне рыдлёўку, каб я зараўняў травіцу, правёў меліярацыю. Ён падпарадкоўваўся спрадвечнай народнай культуры ва ўзаемаадносінах беларусаў і прыроды. Ворвочэнскэ – узор меліярацыі. Зямля паляпшалася безупынна дзеля дабрабыту таго, хто яе паляпшаў: карчаваў лазняк, валіў гной, ствараў севазварот, не сушыў балота, зберагаў ваду. Меліярацыя і культура не супярэчылі адно аднаму. Чуеце, палітызаваныя акадэмікі і саўковыя цэнзары! Вы дагэтуль ушчуваеце мяне, што я супраць меліярацыі. А я, бачыце, – паэт меліярацыі.

Да вострава вяла грэбля. Да павароткі на грэблю за рулём трактара звычайна сядзеў я, а тут бацька кажа, што я не ўмею руліць, зганяе з

сядзення, забірае ў мяне жалезнага каня. Чаму – я разумеў, калі па грэблі ішоў услед за трактарам. Страшана было назіраць, як колы рассоўваюць тоўстае голле, правальваюцца ў балота, і трактар вось-вось паваліцца на бок.

Да поўнай культуры востраву не ставала надзейнай дарогі. Поле Ворвочэнскэ землякі да ладу давялі, а да дарогі, як кажуць, не дайшлі рукі. Не хапіла нейкіх дзесяці гадоў. Я ўпэўнены: разам з трактарам да землякоў абавязкова прыйшла б думка ўдасканаліць пяцьсот метраў грэблі.

Што зрабілі б землякі, калі б у Горску не з'віліся Саветы? Перш-наперш да грэблі гарчакі навазілі б трактарам шмат пяску, гэтага дабра на Палессі хапае. З пясочку атрымаўся б дыхтоўны насып. Каб веснавое балота яго не злізала, мой бацька і ягоныя сябрукі – Сцяпан, Лявон, Максім, Рыгор, Ілля – прывезлі б вялізных камянёў, умацавалі б абочыну. Затым чарназёмам засыпалі б тыя камяні, пасадзілі б вярбу, каб каранямі моцна трымала дарогу ў абдымках.

Калі б паляпшаць зямлю дазволілі самому народу, ён давёў бы свой вопыт да дасканаласці, да існай цывілізаванасці. Да меліярацыі вышэйшага гатунку.

Не дазволілі. Заставілі знішчыць родны кут, забыць роднае слова – Ворвочэнскэ.

Згаладаламу ў калгасе бацьку паабяцалі добры заробак, далі экскаватар. Бацька сеў за рычагі і асушыў Ворвочэнскэ. Скончыўшы школу, я стаў практыкантам у бацькі-экскаватаршчыка. Ён вучыў мяне, як спрытней выкапаць канал, як хутчэй спусціць ваду з нашага балота, як знішчыць Ворвочэнскэ і іншыя астраўкі культуры ў ваколіцах Горска: Язвыны, Вовчэ, Гостров, Тёмнэнькэ, Довгэнькэ, Тодорова Гора…

Гэты Тодар купіў гару, на якой ранейшы гаспадар спілаваў лес. Тодар карчаваў пні, спальваў на месцы, даваў зямельцы гною, паліваў потам. І зямля давала яму на жыццё.

Побач з гарой была нізінка. Там Тодар пракапаў канаўку, вадой з яе асвяжаў гару. Касіў на лузе сена, гадаваў карову і авечак. Той лужок, адабраны ў Тодара калгасам, а пазней асушаны і знішчаны меліяратарамі, у Горску назвалі: Тодоров Луг. Паставілі тапанімічны помнік гаспадару.

На радзіме безліч такіх помнікаў. Напрыклад – Коло Мухэй. У дзіўнаватай тапанімічнай назве ўвекавечана праца трох братоў, якія купілі поле і лес, мітусіліся там у клопатах, як мухі. Лес па-гаспадарску выразалі – не ўвесь адразу, а толькі спелы, пакідаючы падлесак і падрост. Беларусы былі экалагічна свядомымі. Грошы за лес браты ўкладвалі ў поле ў выглядзе гною, бо трымалі многа жывёлы.

Добра апрацаваную зямлю братоў Мухэй напаткаў трагічны лёс стараворыўных земель Беларусі. Кінуўшы ўгноенае поле, калгас атрымаў ад дзяржавы ладны кавалак на асушаным балоце. Вось вам прычыны і мэты беларускай меліярацыі! Бальшавікам было прасцей адняць у прыроды новае поле, чым клапаціцца пра старое. Так яны апаганілі зямлю, пакарылі Палессе, паспелі асушыць значную частку Белавежскай пушчы, пачалі спрамляць Прыпяць.

У бальшавікоў, бязлітасных пакарыцеляў усяго жывога, прысутнічала вострае пачуццё самазахавання. Каб іх саміх не засыпала пяском з пакінутага

стараворыўнага поля, яны загадалі садзіць там лес. Калі б пакінутыя землі не засадзілі сасной – толькі сасна можа прыжыцца на сухім пясочку – то Беларусь ужо зрабілася б пустыняй Сахара. Маладыя лясы запаволілі апустыньванне нашай краіны.

Народнай павагі заслугоўваюць леснікі, што зрабілі добрую справу. Але народ не захаваў іх імёны ў тапаніміцы. У прыродным маўзалеі – тапаніміцы – захоўваецца адвечны, лагічны, экалагічна і эканамічна абгрунтаваны парадак. Ён вызначаецца раўнапраўем зямлі і чалавека. Помнікі ставяць толькі гаспадару.

Персанальныя тапанімічныя помнікі паставіў сам народ. Значыць, ён разумее, што робіць і што помніць. Разумее, што зямля не павінна быць усенароднай – нічыёй.

Калі б у тапаніміцы захаваліся імёны заваёўнікаў прыроды, то Беларусь ператварылася б у маўзалей герастратаў. А, бачыце, не!

Колькі панакапана каналаў, а ўсе – безыменныя, бязлікія. Дзе-нідзе захаваліся толькі назвы, ўзятыя з праектнай дакументацыі: канал першы, водапрыёмнік цэнтральны.

Скажу непрыемную рэч: беларускі народ заслугоўвае звання народа-герастрата. Бо ён сам, уласнымі рукамі садраў са сваёй зямлі культурны пласт. Яго заставілі.

Савецкая дзяржава здолела хутка правесці татальную меліярацыю таму, што ў гэтым самагубстве ўдзельнічаў увесь народ. У меліярацыйных арганізацыях плацілі значна больш, чым у калгасе. Усе механізатары Горска пайшлі ў экскаватаршчыкі.

Каля роднай вёскі, па цэнтры арэхавага вострава Язвыны, мой бацька вырыў глыбозны канал, які высушыў Язвыны, балоты, калодзежы ў вёсцы. Той канал празвалі Басукуов Канал (ад вясковай мянушкі бацькі – Басук). Слава Богу, назва хутка забылася.

Дзякуй, землякі! Ваша непамятлівасць да падобных геройстваў упэўнівае мяне, што вы перш за ўсё стваральнікі. Вашае слова адклікаецца толькі на тое, што кладзецца ў падмурак жыцця. Тут вы кожнаму каменьчыку гатовыя даць імя.

1994-2005